# ДЗЯРЖАЎНАСЦЬ, МІЖДЗЯРЖАЎНЫЯ АДНОСІНЫ



**Галіна Дзербіна (Мінск)**

## СТАТУТЫ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА ЯК ПРАЯВА ПРАВАВОЙ КУЛЬТУРЫ РЭНЕСАНСУ

Эпоха Рэнесансу у культуры Еўропы вызначыла права як асноўны фактар, праз які бачылася развіццё грамадства. Права разглядалася як сінтэз фундаментальных ідэалаў, пакладзеных грамадствам у аснову сваёй практычнай дзейнасці.

Да асноўных фактараў, якія сфарміравалі юрыспрудэнцыю Рэнесансу, сучасныя даследчыкі адносяць наступныя працэсы ў гісторыі права: рэцэпцыя раманістычных нормаў і паняццяў; тэндэнцыя да кадыфікацыіі права на падставе рацыяналізацыі яго канцэпцыі; актыўнае ўздзеянне культуры Рэнесансу [1] .

Права Вялікага Княства Літоўскага, адлюстраванае ў Статутах ВКЛ 1529, 1566 і 1588 гг., з'явілася найбольш выразнай праявай рэнесанснай юрыспрудэнцыі краінаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Выразны рэнесансны характар Статутаў даследчыкі лічаць адметнасцю развіцця права ВКЛ XVI ст. на фоне тагачасных помнікаў права суседніх краін [2] . Гэты вывад мае канцэптуальны характар і дапаўняе традыцыйны падыход, у якім

---

[1] Bardach J. Statuty litewskie a prawo rzymskie. Warszawa, 1999. S. 9–10, 22–26; Uruszczak W. Europejskie kodeksy doby Renesansu // Czasopismo Prawno-Historyczne. 1988. T. XL. Z. 1. S. 65; Robinson O. F., Fergus T. D., Gordon W. M. European legal history. London; Dublin; Edinburgh, 1994. P. 166–178; Давид Р., Жофре-Спинози К. Основные правовые системы современности. М., 1998. С. 36–37, 40–43.

[2] Бардах Ю. Литовские статуты — памятники права периода Возрождения // Культурные связи народов Восточной Европы в XVI в. М., 1976. С. 71–93; Bardach J. Statuty Litewskie a prawo rzymskie. S. 1–14, 16, 22, 86, 92–94; Maciejowski W. A. Historia prawodawstw slowianskich. Warszawa. 1856. T. 1. S. 207.

падкрэслівалася «спазненне» і «незавершанасць» шматлікіх эканамічных, ідэалагічных і сацыяльных з’яў як характэрных рысаў эпохі на Беларусі [3]. Паспяховай эвалюцыі прававой сістэмы ВКЛ спрыялі дынамічнае развіццё культуры, эканомікі і палітычных адносін, дасягненне шляхтай уплывовай ролі ў кіраванні дзяржавай [4]. Вядомы польскі даследчык Ю. Бардах звяртае ўвагу на важную задачу кансалідацыі зямель ВКЛ у XVI ст., якая патрабавала адзінай прававой сістэмы, а знешнім уплывовым фактарам разглядае персанальную унію ВКЛ і Польшчы, што вымагала прававога акрэслення ўласнай суверэннасці [5]. Непасрэдны ўплыў на высокі ўзровень заканадаўства, як уяўляецца, аказала адзіная канцэпцыя права, якой кіраваліся і паслядоўна ўдасканальвалі ў трох кадыфікацыях, і высокі навуковы ўзровень членаў статутавых камісій, якія надалі канцэпцыі права рэальныя формы і рысы рэнесанснага заканадаўства. Кожны Статут разглядаецца даследчыкамі пераважна як асобная кадыфікацыя, на якую істотны ўплыў мела рэцэпцыя рымскага права [6]. Спецыяльнаму разгляду гэтага аспекта гісторыі права ВКЛ прысвечана работа Ю. Бардаха «Літоўскія Статуты і рымскае права» [7].

XVI ст. для ВКЛ было часам росквіту культуры і рэфармавання грамадства : ад эканамічнай рэформы да перабудовы палітыка-прававой сістэмы. Вядомыя мысляры, палітыкі і юрысты — Ф. Скарына, М. Літвін, А. Волан, С. Будны, В.Чырка, А. Ратондус, П. Раізій, Я. Даманеўскі, М. Валадковіч, П. Астравецкі, С. Габрыяловіч, А. Гаштольд, Я. Глябовіч, М. Радзівіл Чорны, М. Радзівіл Рыжы, А. Валовіч, К. Радзівіл Пярун, Л. Сапега і іншыя — працавалі ў розных накірунках на аўтарытэт права і развіццё правасвядомасці грамадства. Падмуркам, на якім атрымалі развіццё правы розных саслоўяў, сталі ідэі аб каштоўнасці чалавека як асобы і роўнасці ўсіх перад законам, вяршынства закону разглядалася як аснова цывілізаванага грамадства.

На падставе новай канцэпцыі ў Статутах узмацнілася юрыдычная абарона правоў асобы. Адпавядала эпосе гуманізму найперш скарачэнне крыніц нявольніцтва і фарміраванне ў праве інстытуту прэзумпцыі невінаватасці: у другім Статуце толькі для шляхты, а у трэцім Статуце для людзей усіх станаў. У Статут 1588 г. была ўведзена норма аб адказнасці шляхты

---

[3] Падокшын С. А. Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі. Мн., 1990. С. 45–61, 62–68.

[4] Бардах Ю. Литовские статуты — памятники права периода Возрождения // Культурные связи народов Восточной Европы в XVI в. М., 1976. С. 71–93; Bardach J. Statuty Litewskie a prawo rzymskie. S. 1–14, 16, 22, 86, 92–94; Maciejowski W. A. Historia prawodawstw slowianskich. T. 1. S. 207.

[5] Bardach J. Statuty Litewskie a prawo rzymskie. S. 22–23.

[6] Лаппо И. И. Литовский Статут 1588. Каунас, 1936. Т. 1. Ч. 2; Пичета В. И. Белоруссия и Литва XV–XVI вв. М., 1961.

[7] Bardach J. Statuty litewskie a prawo rzymskie.

за забойства простага чалавека, неабходнасць якой абгрунтоўвалі А. Волан, А. Ф. Маджэўскі і інш. у сваіх працах. Уніфікацыя права была накіравана на роўнасць усіх перад законам, але гэты прынцып толькі пачаў зацвярджацца ў праве і дзейнічаў выбарачна. Пераважна забяспечвалася роўнасць усіх у прыватным праве, дзе найбольш дэталёва распрацаваны інстытуцыі, якія датычацца абавязкавых, рэчавых і сямейна-маёмасных дачыненняў. Права адлюстроўвала падзел на саслоўі і пераважна іх няроўнасць перад законам, але ўраўнаванне правоў у межах аднаго саслоўя.

Прынцып «фармальнай» роўнасці быў пакладзены ў аснову ўраўнавання правоў паноў і шляхты і абмежавання ўлады манарха. Статут 1588 г. зацвердзіў пераход заканадаўчай улады да сейма, але рэарганізацыю сейма пасля Люблінскай уніі і стасункаў паміж ВКЛ і Польшчай закон непасрэдна не адлюстраваў. Заканадаўства зацвердзіла асновы палітычнай сістэмы дзяржавы і яе суверэнітэт.

Высокі для свайго часу ўзровень юрыдычнай тэхнікі адлюстраваўся ў яснай, дакладнай дзяржаўнай мове (старабеларускай) Статутаў, насычанай юрыдычнай тэрміналогіяй. У тэксце ўжыты юрыдычныя канструкцыі, агульныя для рамана-германскай прававой сістэмы, сфарміраваны прэзумпцыі і юрыдычныя фікцыі. Нормы права набылі больш абстрактны характар і структуру, склалася сістэма інстытутаў. Сеймамі была распрацавана працэдура прыняцця законаў і ўступлення іх у дзеянне, што садзейнічала павелічэнню ролі закона ў жыцці грамадства. Менавіта дасканалае рэгуляванне прыватных і публічных адносін з’явілася падставай для запазычання Статутаў суседнімі краінамі.

Навука права і юрыдычная адукацыя, ідэі гуманізму і Рэфармацыі мелі непасрэднае і апасродкаванае ўздзеянне на фарміраванне канцэпцыі права і распрацоўку Статутаў. Найбольш яскрава сувязь гэтых фактараў выяўлялася праз дзейнасць статутавых камісій і канкрэтных асоб. Вядомымі ўплывовымі асобамі, якія адыгралі значную ролю ў кадыфікацыі права, з’яўляліся навукоўцы-юрысты А. Ратондус і П. Раізій. Непасрэднае дачыненне да заканадаўчай дзейнасці мела канцылярыя ВКЛ. Юрыспрудэнцыя ВКЛ XVI ст. была цесна звязана з імёнамі канцлераў і падканцлераў А. Гаштольда, М. Радзівіла Чорнага, А. Валовіча, М. Радзівіла Рыжага, К. Радзівіла Перуна, Л. Сапегі.

Імёны навукоўца Пятра Раізія (doctor utrius iuris, доктар і кананічнага і рымскага права) і канцлера Л. Сапегі аб’ядноўваюць Статуты 1566 і 1588 гг., якія зацвердзілі дзяржаўную незалежнасць ВКЛ. П. Раізій, іспанец па паходжанню, увайшоў у гісторыю права ВКЛ як прадстаўнік гуманістычнай школы права, якая ўзнікла у XVI ст. на фоне агульных тэндэнцый адраджэння антычнай культуры, уплыву ідэй гуманізму і рэфармацыйных вучэнняў. Канцэпцыя школы засноўвалася на натуральна-прававой дактрыне, тэорыі пагаднення і суверэнітэту і абгрунтоўвала неабходнасць дзяржаўнага заканадаўства, сістэматызацыі і кадыфікацыі мясцовага права.

Школа была створана пераважна юрыстамі Францыі, Германіі, Італіі, але яе ідэі дынамічна распаўсюджваліся ва ўсіх краінах рамана-германскай прававой сістэмы. Школа гуманістаў моцна паўплывала таксама на прававую сістэму ВКЛ, якая ў XVI ст. з’явілася выразным праяўленнем працэсаў развіцця адзінай рамана-германскай прававой сістэмы.

П. Раізій аказаў значны ўплыў на прававую культуру ВКЛ праз выкладанне і кіраванне Святаянскай школай у Вільні, праз работу ў складзе асэсарскага суда [8], напісанне юрыдычнага трактата на аснове судовай практыкі ВКЛ [9], і праз непасрэдны ўдзел у распрацоўцы Статута 1566 г. П. Раізій, які пераехаў у Вільню ў 1552 г., непасрэдна даносіў да сваіх студэнтаў асноўныя ідэі гуманістычнай школы права як вучань яе знакамітага заснавальніка прафесара універсітэта ў Балоньі А Альцыятуса, студэнтамі якога былі і вядомыя ў Польшчы навукоўцы М. Кромер, М. Стрыйкоўскі і С. Мацееўскі.[10] Сваёй выкладчыцкай, практычнай і навуковай дзейнасцю П. Раізій зрабіў важкі ўклад і аказаў значны ўплыў на прававую культуру ВКЛ і Польшчы.

З асобай П. Раізія і развіццём школы пры касцёле св.Яна ў Вільні звязаны пачатак юрыдычнай адукацыі ў ВКЛ [11]. Факт існавання і дзейнасці школы доўгі час выклікаў супярэчлівыя меркаванні з-за недастатковасці дакументальных крыніц. Вядома, што ў 1513 г. пры касцёле св. Яна была адчынена школа, на аснове якой у 1566 г. была заснавана па ініцыятыве Жыгімонта Аўгуста Святаянская школа грамадзянскага права, якую ўзначаліў П. Раізій [12]. Ён жа выкладаў курсы рымскага, саксонскага і магдэбургскага права, а С. Грахоўскі курс права ВКЛ. Школа была пераўтворана П. Раізіем у вучылішча юрыспрудэнцыі, а пасля яго смерці ў 1571 г. езуіты рэфармавалі яе ў гімназію і далучылі да калегіуму [13]. У 1578 г. езуіцкі калегіум у Вільні быў пераведзены ў статус Акадэміі прывілеем Стэфана Баторыя ад 7 ліпеня 1578 г. і зацверджаны булай папы Грыгорыя XIII ад 30 кастрычніка 1579 г., атрымаў права прысвойваць вучоныя ступені, выбіраць сваю адміністрацыю. З 1579–1580 гг. на тэалагічным факультэце Акадэміі выкладалася кананічнае права. Юрыдычны факультэт у акадэміі быў адчынены ў 1641–44 гг. намаганнямі Казіміра Сапегі, сына вядомага канцлера Л. Сапегі.

---

[8] Tazbir J. Polski Słownik Biograficzny. Warszawa; Kraków. XXXI/4. Z. 131. S. 499.

[9] Decisiones Petri Royzii Maurei Alcagnicen Regii iureconsulti de rebus in sacro auditorio Lituanico ex appelatione iudicatis. Cracoviae, 1563.

[10] Chachaj M. Zagraniczna edukacja Radziwiłłow. Lublin, 1995; Pechnik L. Dzieje Akademii Wileńskiej: W 3 t. Rzym, 1983–1987.

[11] Balinski M. Dawna Akademia Wileńska: Próba jej historii od założenia w roku 1579 do ostatecznego jej przekształcenia w roku 1803. Petersburg, 1862. S. 26-27; Kurczewski J. Biskupstwo Wileńskie... Wilno, 1912. S. 318; Лаппо И. И. Литовский Статут 1588. Ч. 1. С. 87–88.

[12] Лаппо И. И. Литовский Статут 1588. Ч. 1. С. 87–88.

[13] Tazbir J. Polski Słownik Biograficzny. S. 499.

Вялікае значэнне юрыдычнай адукацыі надавалі рэфарматары, што адпавядала іх разуменню функцыі права ў грамадстве. Рэфармацыя адыграла важную ролю ў развіцці рамана-германскай прававой сістэмы [14]. Філасофія права рэфарматараў фарміравалася ў вучэннях Лютэра, Меланхтана, Буцэра, Кальвіна, у юрыдычных трактатах Я. Альдэндорпа, М. Клінга і іншых юрыстаў [15]. Ж. Кальвін распрацаваў філасофію свецкага права, у якой яму надавалася значэнне інструменту Рэфармацыі, абгрунтоўвалася неабходнасць кадыфікацыі права для ўдасканалення грамадства [16]. У аснову кальвінскага вучэння аб уладзе манарха пакладзены прынцып выбарнага калектыўнага праўлення, што мела важнае значэнне для развіцця асноў парламентарызму.

Першым вынікам уздзеяння Рэфармацыі на права стаў кадыфікаваны кодэкс крымінальна-працэсуальнага права «Караліна» 1532 г., зацверджаны імператарам Святой Рымскай імперыі Карлам V, які паўплываў на права ВКЛ.

Г. Берман падкрэслівае [17] самастойную ролю прававых вучэнняў рэфарматараў у гісторыі філасофіі права, што ўяўляецца вартым увагі менавіта ў дачыненні да гісторыі права ВКЛ. На гэтую акалічнаць развіцця прававой сістэмы ВКЛ упершыню звярнуў увагу І. Лапо [18]. Уплывовая роля ідэй лідэраў Рэфармацыі ў фарміраванні палітыка-прававой культуры ВКЛ адзначалася ў працах беларускіх даследчыкаў [19]. Працэс кадыфікацыі права ў XVI ст. адбываўся на фоне пашырэння Рэфармацыі ў ВКЛ і прыналежнасці пераважнай часткі палітычнай эліты да пратэстантаў. Па дадзеных М. Космана, колькасць пратэстантаў сярод сенатараў ВКЛ у 1569 г. складала 60%, у 1590 г. — 40%, што было амаль у два разы больш, чым у Польшчы [20]. З іх 35%, па падліках М. Хахая, у 1587 г. мелі вышэйшую адукацыю, атрыманую ў замежжы. Ускосна такія падлікі могуць сведчыць аб пераважным навучанні магнатаў ВКЛ у пратэстанцкіх універсітэтах Германіі і Швейцарыі.

Выразным адлюстраваннем уплыву кальвінізму на палітычную эліту ВКЛ з'яўляецца склад службоўцаў канцылярыі ВКЛ, якая з другой паловы

---

[14] Берман Г. Вера и закон: примирение права и религии. М., 1999. С. 174, 210–212.

[15] Тамсама. С. 130–134.

[16] Calvin John. Institutes of the Christian Religion // Boyer J. W., Kirshner J. University of Chicago Readings in Western Civilization. The Renaissance. V. 5. P. 567–386.

[17] Tazbir J. Polski Słownik Biograficzny. S. 499.

[18] Лаппо И. И. Литовский Статут 1588. С. 44–46.

[19] Падокшын С. А. Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі: Ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага Мн., 1990. С. 192–225; Падокшын С. А., Сокал С. Ф. Палітычная і прававая думка Беларусі XVI–XVII стст. Мн., 1999. С. 76–98; Сокол С. Ф. Политическая и правовая мысль в Белоруссии XVI – первой половины XVII в. Мн., 1984. С. 35–48; Шалькевіч В. Ф. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі. Мн., 1999. С. 83–98.

[20] Kosman M. Konwersje protestantów w Wielkim Księstwe Litewskim // Шлях да ўзаемнасці. Беларусіка = Albaruthenica. Кн. 15. Мн., 2000. С. 183.

XVI ст. адыгрывала асноўную ролю ў працэсе кадыфікацыі права. На пасадах канцлераў і падканцлераў ВКЛ з другой паловы XVI ст. да 1587 г. знаходзіліся ўплывовыя кальвіністы: М. Радзівіл Чорны ў 1551–1565 гг., М. Радзівіл Рыжы ў 1565–1579 гг., А. Валовіч у 1579–1587 гг., падканцлеры К. Радзівіл Пярун у 1579–1585 гг., Л. Сапега ў 1585–1589 гг. Пратэстантамі былі і іншыя вышэйшыя службоўцы ВКЛ.

У сувязі з асаблівай увагай пратэстантаў да юрыдычнай адукацыі лепшымі агульнаадукацыйнымі навучальнымі ўстановамі ў XVI ст., дзе выкладалі права, лічыліся кальвінісцкія вучылішчы (калегіумы) і арыянскія школы. Вядома, што такія вучылішчы і школы былі адчынены ў Слуцку, Іўі, Клецку, Койданаве, Любчы, Лоску, Нясвіжы, Навагрудку. Юрыдычную падрыхтоўку атрымоўвалі і ў «палестрах», якія дзейнічалі па прынцыпу практычнай падрыхтоўкі памочнікаў пры кваліфікаваных юрыстах [21]. Але класічная вышэйшая юрыдычная адукацыя набывалася пераважна ў замежных універсітэтах. Юрыспрудэнцыю вывучалі студэнты з ВКЛ у Празе, Кракаве, Круляўцы, найчасцей у Балоньі, Падуі, Рыме, Арлеане, Парыжы, Вітэнбергу, Лейпцыгу, Марбургу, Цюбінгене, Гейдэльбергу, Кёльне, Франкфурце-на-Одэры, Базэлі, Жэневе, Цюрыху.

У XVI ст. у ВКЛ былі запатрабаваны прафесійныя юрысты і службоўцы, якія мелі прававыя веды, што адлюстравалася на папулярнасці юрыдычнай адукацыі. Вынікала гэта не толькі з агульнага высокага ўзроўню культуры эпохі, але з практычных патрэб палітыка-прававой сістэмы дзяржавы. Адміністрацыйная і судовая рэформы 1560-х гг., развіццё прадстаўнічых інстытутаў, рэгулярная дзейнасць павятовых, генеральных соймікаў і вальных сеймаў, Галоўнага трыбунала ўзвышалі аўтарытэт права і рабілі яго ўмовай паспяховай кар’еры, абумовілі патрэбу ў юрыстах-прафесіяналах. Пасля адкрыцця лютэранскага універсітэта ў Крулеўцы ў 1544 г. пачаўся трывалы працэс замежнага навучання шляхты, асновай якога было распаўсюджванне ў княстве рэфармацыйных плыняў. Заканадаўства адлюстравала стаўленне грамадства да адукацыі: яшчэ ў прывілеі Казіміра 1447 г. і Статуце ВКЛ 1529 г. выезд за мяжу разглядаўся як права шляхты ў мэтах навучання рыцарскім учынкам, а права на выезд за мяжу для адукацыйных мэтаў атрымала шляхта і «кождый человек рицерский и всякого стану того паньства…» у Статутах 1566 і 1588 гг. (р. ІІІ, арт. 16).

Склалася новая мадэль адукацыйнай падрыхтоўкі палітычнай эліты. Ужо ў першай палове XVI ст. сярод шляхты Польшчы і ВКЛ стала папулярным навучанне моладзі ў замежных універсітэтах, у канцы XVI – пачатку XVII ст. гэтыя працэсы дасягнулі свайго найбольшага развіцця [22].

---

[21] Сокол С. Ф. Политическая и правовая мысль в Белоруссии XVI – первой половины XVII в. С. 33.

[22] Chachaj M. Zagraniczna edukacja Radziwiłłow od początku XVI do polówy XVII wieku. S. 13–14.

Культура і навука эпохі Рэнесансу развіваліся і распаўсюджваліся ў значнай меры праз еўрапейскія універсітэты і адукацыю, а таксама праз цэнтры кнігадрукавання. Кнігадрукаванне заняло важнае месца ў развіцці права, друкаваныя тэксты рабілі законы даступнымі для шырокага кола і спрыялі распаўсюджванню прававых ведаў.

Разуменне неабходнасці друкаваных законаў існавала ў ВКЛ ад самага пачатку працы над Статутам 1529 г., асабліва на фоне друкавання законаў у Польшчы, дзе першы друкаваны збор праў «Sintagmata» з'явіўся ў 1487 г., друкаванне першага сістэматызаванага збора — Статута Яна Ласкага — адбылося ў 1506 г. як першага дзяржаўнага (урадавага) выдання. Друкаванне першага Статута было зацверджана прывілеем 1522 г., але з-за адсутнасці ў гэты час у Вільні друкарняў з кірылічным шрыфтам пасля ад'езду Ф. Скарыны Статут 1529 г. не быў надрукаваны. Неабходна звярнуць увагу на факт падрыхтоўкі Статута на старабеларускай — дзяржаўнай — мове [23]. У Польшчы першымі актамі заканадаўства на польскай мове былі соймавыя канстытуцыі 1543 г. Дзяржаўнай мове ВКЛ надавалася палітычнае значэнне фактара праявы суверэнітэта. Традыцыя кнігадрукавання кірыліцай Ф. Скарыны была адноўлена ў сярэдзіне XVI ст. А. Валовічам, С. Будным, М. Радзівілам Чорным, Мамонічамі і інш. У 1562 г. былі выдадзены кірыліцай «Катэхізіс» і «Пра апраўданне грэшнага чалавека перад Богам» С. Буднага. Патрыятызм А. Валовіча адлюстраваўся ў падрыхтоўцы прадмовы да другога Статута і канцэпцыі трэцяга Статута. Адзіная канцэпцыя дзяржаўнасці і права ВКЛ аб'яднаўвала яго з канцлерам М. Радзівілам Рыжым і Я. Хадкевічам напярэдадні Люблінскай уніі пры складанні канфедэратыўнага праекта уніі ВКЛ і Польшчы. Канцлер А. Валовіч працаваў над стварэннем Галоўнага Літоўскага трыбуналу, закон аб якім быў прыняты ў 1581 г. Трыбунал, па якім шляхта атрымала права незалежнага выбарчага вышэйшага суда, быў надрукаваны ў 1586 г. на старабеларускай мове ў друкарні Мамонічаў коштам канцлера А. Валовіча, што адпавядала дэмакратычнай сутнасці выбарчага апеляцыйнага суда. Упершыню закон атрымаў дасканалую друкаваную форму.

Друкаваліся юрыдычная літаратура і заканадаўчыя дакументы ў ВКЛ на польскай, лацінскай і старабеларускай мовах, усяго было выдадзена ў XVI ст. 16 юрыдычных выданняў. Першымі друкаванне юрычных выданняў пачалі рэфарматары. У друкарні ў Брэсце, якою апекаваўся М. Радзівіл Чорны ў 1550-х гг., былі надрукаваны на польскай мове працы Б. Гроіцкага — Уставы польскага права — у 1559–1560 гг., Устава плацяжоў і судоў

[23] Журавский А. О канцелярском языке Великого княжества Литовского // Ежегодник истории Литвы. Год 1983. Вильнюс, 1984. С. 17–32; Власова Т. П. О некоторых языковых особенностях белорусских списков Первого Литовского Статута (1529) // Первый Литовский Статут 1529 года: (Материалы республиканской научной конференции, посвященной 450-летию Первого Статута). Вильнюс, 1982.

ў 1560 г., Статуты Варшаўскага сейму ў 1561 г. [24]. Пазней друкаванне прававой літаратуры ажыццяўлялася ў друкарні Мамонічаў у Вільні, якой афіцыйна даручалася (па прывілею Стэфана Баторыя ад 13 сакавіка 1586 г.) друкаваць дзяржаўныя дакументы. У Мамонічаў былі надрукаваны на старабеларускай мове найважнейшыя для дзяржавы законы: у 1586 г. Трыбунал 1581 г., Статут 1588 г., які меў некалькі перавыданняў, тры або чатыры выданні на старабеларускай мове ў 1592–1593, 1594–1595, яны мелі некаторыя разыходжанні, і пры гэтым датаваліся 1588 г. [25], агульны тыраж склаў 4 000 экз. Друкарня Мамонічаў выдавала юрыдычную літаратуру і на польскай мове — з 1589 па 1624 г., найперш сеймавыя канстытуцыі, у 1614 і 1619 гг. у друкарні быў перавыдадзены Статут 1588 г. у перакладзе на польскую мову.

Акрамя заканадаўчых выданняў друкаваліся юрыдычныя навуковыя працы, якія аказвалі ўплыў на права ВКЛ. У Кракаве ў 1563 г. была надрукавана знакамітая работа П. Раізія «Decisiones…», тэарэтычныя высновы якой былі зроблены на падставе абагульнення судовай практыкі вышэйшых судоў ВКЛ: прааналізавана роля права і закону ў жыцці грамадства і дадзена канкрэтнае вырашэнне складаных юрыдычных пытанняў. П. Раізій сфармуляваў тэзіс аб тым, што рэальнае панаванне справядлівасці ў грамадстве залежыць ад дзейнасці ўрадавых структур, якія праводзяць законы ў жыццё: «Бо не тая дзяржава, якая мае законы і пэўнае права, але тая, якая ўжывае законы і пэўнае права» [26]. П. Раізій лічыў, што дзяржава трымаецца на справядлівых законах і справядлівых выканаўцах законаў, таму абгрунтоўваў неабходнасць атрымання юрыдычнай адукацыі ўсімі дзяржаўнымі службоўцамі і распаўсюджвання прававых ведаў сярод усіх саслоўяў грамадства, асабліва сярод шляхты. Навуковая спадчына П. Раізія ўвайшла ў скарбніцу прававой культуры ВКЛ, яго разуменне права, практычны і тэарэтычны вопыт былі скарыстаны пры распрацоўцы Статутаў 1566 і 1588 г.

Вопісы кнігазбораў і іншыя дакументы сведчаць аб значнай колькасці юрыдычнай літаратуры ў бібліятэках эліты. У бібліятэцы Жыгімонта Аўгуста налічвалася больш за 356 тамоў спецыяльнай юрыдычнай літаратуры [27], у ёй былі сабраны працы ўплывовых юрыстаў Еўропы да сярэдзіны XVI ст.

У ВКЛ першы кадыфікаваны закон рыхтаваўся доўгі час: з 1501 да 1522 г., калі сейм абмеркаваў падрыхтаваны праект і зацвердзіў яго

---

[24] Белоруссия в печати XVI столетия. Мн., 1985. С. 46.

[25] Кніга Беларусі 1517–1917: Зводны каталог. Мн., 1986. С. 65.

[26] Decisiones Petri Royzii maurei alcagnicen Regii iureconsulti de rebus in sacro auditorio lituanico ex appellatione iudicatis. P. 3-4.

[27] Kawecka-Gryczowa A. Biblioteka ostatnego Jagiellona pomnik kultury Renesansowej. Wrocław; Warszawa; Kraków; Gdańsk; Łódź. S. 125–179.

друкаванне, сейм 1528/1529 гг. Статут ухваліў. Высокі ўзровень кадыфікацыі адразу быў заўважаны, у 1531 г. Статут 1529 г. быў перакладзены на лацінскую мову для Польшчы і выкарыстаны пры распрацоўцы «Correctura uirim» («Карэктура Ташыцкага») 1532 г. Грамадска-палітычнае жыццё ВКЛ развівалася інтэнсіўна і пытанне аб выпраўленні і друкаванні новага Статута было пастаўлена шляхтай на Берасцейскім сейме 1544 г, стварэнне статутавай камісіі і рашэнне аб друкаванні новага Статута былі зацверджаны толькі на Віленскім сейме 1551 г. Новы Статут быў прыняты на Бельскім сейме 1564 г., але канчаткова ўведзены ў дзеянне толькі ў 1566 г. Па ініцыятыве А. Ратондуса другі Статут ствараўся на двух мовах — сталабеларускай і лацінскай, камісія прыняла двухмоўную версію, што спрыяла ўплыву рымскага права. Выкарыстанне як саміх нормаў рымскага права, так і латыні ў юрыспрудэнцыі таго часу было звычайнай з’явай [28]. Але лацінская версія была адхілена Віленскім сеймам 1564 г., магнаты і шляхта разглядалі лацінскую мову як неадпаведную дзяржаўнаму заканадаўству і канцэпцыі права суверэннай дзяржавы, як мову езуітаў. Віленскі сейм ясна прадэманстраваў прыхільнасць палітычнай эліты да разнавер’я. Пытанне веравызнання аб’яднала ўсе саслоўі, і сейм 1565–1566 гг. зацвердзіў Статут на дзяржаўнай мове. Працэс кадыфікацыі права на гэтым не спыніўся, прадаўжалася праца над удасканаленнем заканадаўства і адлюстраваннем палітычных зменаў, новая статутавая камісія, створаная ў 1569 г., рыхтавала трэці Статут.

Канцэпцыя права фарміравалася пад уплывам работ Ф. Скарыны, С. Буднага, А. Волана, М. Літвіна, П. Раізія і інш. мысліцеляў і юрыстаў. Важная роля ў распрацоўцы тэарэтычнай асновы тагачаснага права належала выдатнаму польскаму юрысту XVI ст. Анджэю Фрычу Маджэўскаму, які ў сваёй працы « Аб выпраўленні дзяржавы» (1551) [29] распрацаваў шэраг ідэй аб рэфармаванні дзяржаўнага ўладкавання і права, роўнасці ўсіх перад законам, абароне жыцця і годнасці асобы простага чалавека. Дасканаласць заканадаўства А. Маджэўскі звязваў з узроўнем палітычнай і прававой культуры грамадства. Гэтыя ідэі пераклікаліся з асноўнымі палажэннямі твораў А. Волана, П. Раізія, М. Літвіна. Праца А. Маджэўскага была перакладзена і выдадзена ў ВКЛ намаганнямі С. Буднага, А. Волана, М. Дарагастайскага ў 1577 г. у Лоску. Яна мела моцны ўплыў на прававую культуру ВКЛ, пэўныя прапановы А. Маджэўскага былі рэалізаваны ў Статуце ВКЛ 1588 г. Менавіта на падставе ідэй філосафаў і юрыстаў развівалася канцэпцыя права ВКЛ, якую сфармуляваў Л. Сапега ў сваіх прадмовах да Статута 1588 г.

Леў Сапега стаў вядомы ў гісторыі як «страж правоў Літвы» і «літоўскі Салон» у сувязі з распрацоўкай, зацвярджэннем і друкаваннем Статута 1588 г. і яго папулярызацыяй у грамадстве. Імя Л. Сапегі ў гісторыі прававой

---

[28] Акты Виленской археографической комиссии. Вильно, 1893. Т. XX. С. 67.

[29] Modrzewski A. F. O prawie Rzeczypospolitej. Warszawa, 1953.

культуры непасрэдна звязана са Статутам 1588 г. як сімвалам дзяржаўнасці і незалежнасці Вялікага Княства Літоўскага ў супольнасці Рэчы Паспалітай. Адметнасць ролі Л. Сапегі ў гісторыі права выявілася праз завяршэнне намаганняў пакаленняў палітыкаў, навукоўцаў, юрыстаў-практыкаў па стварэнню дасканалых законаў, якія павінны былі гарантаваць ВКЛ захаванне дзяржаўнасці і абарону інтарэсаў і правоў усіх яе жыхароў. Л. Сапега прадоўжыў працу знакамітых канцлераў-кальвіністаў — М. Радзівіла Чорнага, М. Радзівіла Рыжага, А. Валовіча. Л. Сапега належаў да кальвіністаў, але ў 1586 г. прыняў каталіцтва і пазней сваю прыхільнасць да кальвінізму лічыў памылкай маладосці, што зазначыў у тастаменце ад 1633 г. [30]. Але ў час стварэння рэнесанснага заканадаўства пратэстанцкая ідэя рэфармавання грамадства праз прававыя інстытуты спрыяла кадыфікацыі і ўплывала на развіццё правасвядомасці грамадства. Атрымаўшы пасаду падканцлера ў 1585 г., канцлера ў 1589 г., Л. Сапега служыў на гэтай пасадзе да 1623 г., надзейна захоўваючы правы і вольнасці народа ВКЛ. Сваім галоўным абавязкам лічыў « права вольнасти и свабоды народов не только цело и непорушно держати, але што бы наболей примножати, справедливость и оборону чынити…» [31].

Намаганнямі падканцлера Л. Сапегі трэці Статут быў зацверджаны 28 студзеня 1588 г., а праз два тыдні 11 лютага 1588 г. Жыгімонт Ваза выдаў прывілей на друкаванне Статута на старабеларускай (рускай) і польскай мовах, які з'явіўся прызнаннем адметнай ролі Л. Сапегі ў справе зацвярджэння Статута. У прывілеі [32] адзначана, што права на друкаванне на «рускай» і польскай мовах даецца яму за карысную службу за захаванне правоў і вольнасцей грамадства. З прывілея вынікала, што Л. Сапегу належыць права вызначэння тэрміну і колькасці выданняў, неабмежаванае права на друкаванне, але за свой кошт. Падканцлер імкнуўся найперш надрукаваць Статут і іншыя законы на старабеларускай мове, падкрэсліўшы ў сваіх зваротах-прысвячэннях важную ролю дзяржаўнай мовы для разумення заканадаўства і абароны правоў і вольнасцей кожнай асобы. Цікавую ў гэтым аспекце акалічнасць развіцця канстытуцыйнага права ВКЛ узгадаў А. Закшэўскі [33] — прапанову вядомага польскага юрыста Я. Янушоўскага, які ў 1611 г. звярнуўся да Л. Сапегі. Я. Янушоўскі прапанаваў выданне адзінага збору прывілеяў і канстытуцый сеймаў ВКЛ і Польшчы з часоў пярэдадня Люблінскай уніі. Л. Сапега не палічыў ідэю мэтазгоднай, хаця праца па збіранню законаў, якія рэгулявалі дзяржаўнае ўладкаванне ВКЛ, у той час ішла, але так і не была завершана. Адметнае стаўленне канцлера да гэтай

[30] Цыт. па кн: Leonas Sapiega. Vilnius, 1998. P. 122.

[31] Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588. Мн., 1989. С. 42–48.

[32] Тамсама.

[33] Zakrzewski A. Offerta Jana Januszowskiego wobec Lwa Sapehy, czyli nieznany projekt wydania praw i przywilejów litewskich z 1611 roku // Prawo wczoraj i dziś. Warszawa, 2000. S. 435–441.

прапановы падкрэсліла афіцыйную традыцыю ВКЛ адносна прыняцця і друкавання законаў, якія б адпавядалі палітычным інтарэсам і захаванню суверэнітэту менавіта ВКЛ. Заканадаўства стала найважнейшым палітычным фактарам. Статут 1588 г. быў зацверджаны як аснова палітыка-прававой самастойнасці ВКЛ у супольнасці Рэчы Паспалітай і гарантый правоў і свабод усіх саслоўяў грамадства.

Канцэпцыя кадыфікацыі права ВКЛ фарміравалася на падставе новых ідэй эпохі. Вынікам сінтэзу развіцця правасвядомасці грамадства, дасягненняў навукі і назапашання законатворчага вопыту з'явілася лепшая кадыфікацыя XVI ст. — Статут 1588 г. Л. Сапега як захавальнік правоў і вольнасцей грамадства стварыў спрыяльныя ўмовы для распаўсюджвання дасканалага заканадаўства ў ВКЛ і папулярызацыі ідэі прававой дзяржавы, развіцця прававой культуры грамадства. Роля Л. Сапегі ў прававой культуры ВКЛ вызначаецца рэалізацыяй у практычнай, палітычнай і заканадаўчай, дзейнасці асноўных прынцыпаў юрыспрудэнцыі эпохі Рэнесансу.

**Яўген Мірановіч (Беласток, Польшча)**

## БЕЛАРУСКІЯ ГАСПАДАРЧЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ Ў ПОЛЬШЧЫ (1920–1921)

Беларускія гаспадарчыя ўстановы ў Польшчы былі, у параўнанні з украінскімі ці літоўскімі (не кажучы пра нямецкія), вельмі слабыя. У ваяводстве Беластоцкім, ці Палескім можна нават гаварыць пра адсутнасць беларускіх гаспадарчых арганізацый. Інертнасць гаспадарчай актыўнасці закранала перш за ўсё тыя землі, жыхары якіх прымалі масавы ўдзел у бежанстве. Пасля вяртання з Расіі іх высілкі былі накіраваны пераважна на пошукі спосабаў біялагічнага выжывання. Большасць жыхароў сваё новае жыццё ў новай дзяржаве пачынала ад адбудовы гаспадарчых будынкаў і жыллёвых памяшканняў. Гэты працэс цягнуўся вельмі доўга. У некаторых раёнах адбудова маёмасці, параўнальнай да тае патрачанай у 1915 г., працягвалася амаль да Другой сусветнай вайны. Цяжкасці ў адбудове былі вынікам адсутнасці крэдытнай сістэмы, гаспадарчых кааператываў і фіскальнай палітыкі ўладаў. Найбольш надзейнай крыніцай пазыкі грошай на практыцы былі мясцовыя габрэі, але сяляне вельмі рэдка будавалі нешта за пазычаныя грошы. Усведамленне пра неабходнасць іх вяртання стрымлівала значную частку мясцовага насельніцтва.

На Беласточчыне і Палессі гаспадарчыя кааператывы не ўзнікалі найперш з-за адсутнасці капіталу. Крыху інакш усё гэта адбывалася на Віленшчыне і

Наваградчыне. Там бежанства мела абмежаваны характар, сяляне былі ў значна лепшай сітуацыі, чым жыхары былой Гарадзеншчыны і Берасцейшчыны. У Віленскім і Наваградскім ваяводствах тады існавалі прынамсі матэрыяльныя ўмовы для якой-небудзь грамадскай дзейнасці.

Асаблівасцю беларускага гаспадарчага руху было тое, што яго ініцыятарамі былі найчасцей палітыкі. Дарэчы, сувязі з палітычнымі коламі ніколі не парываліся. Гаспадарчыя ўстановы ствараліся з мэтай іх «служэння» нацыянальнай справе. Мала ў гэтым гаспадарчым жыцці традыцыйнага лібералізму, у якім эканамічныя патрэбы ўласнікаў выклікалі палітычную ініцыятыву. Але тагачасныя палітычныя ўмовы нічым не нагадвалі ліберальных парадкаў. Таму і вялікая палітызаванасць беларускага не толькі гаспадарчага, але таксама культурнага, асветнага і нават рэлігійнага руху.

Спрыяльны перыяд для беларускага кааператыўнага руху ў Польшчы — гэта час т. зв. «Сярэдняй Літвы» ў пачатку 1920-х гг. Кіраўніком Дэпартамента забеспячэння харчамі ў структурах Правячай камісіі Сярэдняй Літвы быў Вацлаў Іваноўскі. Па яго ініцыятыве на Віленшчыне ўзнікла некалькі беларускіх кааператываў. Яны развіваліся, дзякуючы дзейнасці Іваноўскага, вельмі паспяхова. Аднак пасля далучэння Сярэдняй Літвы да Польшчы большасць беларускіх кааператываў на Віленшчыне абанкруцілася ў выніку канкурэнцыі з боку польскіх гаспадарчых устаноў, якія падтрымліваліся ўладамі. Адкрыта ліквідацыі беларускіх кааператываў дамагаліся віленскія дзеячы найбольш уплывовай польскай партыі Нацыянальнай дэмакратыі[1]. Вельмі выразна відаць, што лёс гэтых кааператываў вырашала не актыўнасць беларусаў, а палітычныя рэаліі. Узнікненне было вынікам палітычнай пазіцыі Вацлава Іваноўскага, а ліквідацыя — перамогай эндэцкай канцэпцыі польскай дзяржаўнасці.

У канцы 1923 г. віленскія дзеячы Юры Сабалеўскі і Язэп Шнаркевіч спрабавалі стварыць сетку кааператываў на Наваградчыне. Праз год пасля гэтага адбыўся з’езд прадстаўнікоў наваградскіх кааператываў, які прыняў дэкларацыю пра апалітычнасць руху. Яны чакалі крэдытнай дапамогі ад дзяржаўных уладаў, аднак гэтага не здарылася. Таму створаныя ў 1923–25 гг. кааператывы ў выніку недахопу фінансавых сродкаў спынілі сваю дзейнасць.

Адраджэнне гаспадарчага руху наступіла ў выніку актывізацыі дзейнасці Беларускай сялянска-работніцкай грамады. Кааператывы, якія ўзніклі па ініцыятыве гэтай партыі, атрымалі інвестыцыйны капітал для пачатку гаспадарчай дзейнасці. Паходжанне гэтага капіталу было не надта ясна акрэсленае, але без сумнення гэта былі палітычныя інвестыцыі[2]. Разам з ліквідацыяй Грамады былі ліквідаваныя ўладамі амаль усе ўстановы, утвораныя партыяй.

---

[1] Gomółka K. Białorusini w II Rzeczypospolitej. Gdańsk, 1992. S. 28.

[2] Archiwum Akt Nowych, zespół Ministerstwa Spraw Wewnetrznych. Sygn. 839/2. Teczka «Hromada a białoruskie kooperatywy».

Большасць грамадоўскіх кааператываў мела гандлёвы і сельскагаспадарчы характар. Іх стваральнікамі былі палітычныя дзеячы. Лідэры Грамады планавалі, што ў будучыні яны пачнуць зарабляць грошы на выдавецкую або асветную дзейнасць, а пазней і на палітычную. Ва ўмовах дэмакратыі гэта звычайны працэс. Цесныя сувязі кіраўніцтва Грамады з Камінтэрнам абумовілі непазбежны канфлікт гэтага руху з польскай дзяржавай.

Па ініцыятыве звязаных з Грамадой дзеячаў у пачатку 1925 г. быў створаны Беларускі кааператыўны банк. У Глыбокім і Пінску ўзніклі яго філіялы. Капітал для заснавання банка афіцыйна быў выдзелены кaператывамі і прыватнымі асобамі. Віленская польская прэса пісала, аднак, пра яго дафінансаванне савецкім бокам[3]. Развіццё кааператыўнага руху ў 1926 г. спрыяла павелічэнню банкаўскага капіталу да 4,5 тыс. долараў. Банк даваў крэдыт велічынёй да ста долараў на 16 спаганяемых працэнтаў. Пры невялікай інфляцыі банкаўскія аперацыі давалі немалы прыбытак. Роля Банка ў беларускім гаспадарчым, выдавецкім, культурна-асветным руху была нярэдка вельмі значнай. Без банкаўскіх крэдытаў шмат беларускіх ініцыятыў ніколі не маглі б рэалізавацца. Ліквідацыя Грамады прывяла да крызісу беларускага банка. Улады ліквідавалі глыбоцкі і пінскі аддзелы, абвінаваціўшы іх дырэктараў у парушэнні польскага банкаўскага заканадаўства. Пастаянныя рэвізіі, арышты членаў управы прывялі Банк да мяжы банкруцтва. У выніку маніпуляцый уладаў у кіруючыя структуры прымаліся людзі без банкаўскага досведчання, дзейнасць якіх вяла да павелічэння фінансавых праблем. У канцы 1938 г. Беларускі кааператыўны банк спыніў сваю дзейнасць.

Найбольш вядомай гаспадарчай беларускай установай у даваеннай Польшчы быў Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры. Ён быў створаны ў маі 1926 г. дзеячамі партый хадэцкага накірунку — Беларускай хрысціянскай дэмакратыі і Беларускага сялянскага саюза. Інстытут планаваўся як альтэрнатыўная ўстанова для арганізацый, якія апынуліся пад кантролем Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ). Падпарадкаванне дзеячамі БСРГ Таварыства беларускай школы прывяло да таго, што гэтая партыя стала манапалістам у беларускім культурным і асветным руху. Адначасова цесныя сувязі Грамады з камуністычным рухам стваралі пагрозу таго, што рэпрэсіі, накіраваныя супраць партыі, закрануць таксама падпарадкаваныя ёй культурныя ўстановы. БХД, ствараючы Інстытут, перш за ўсё прадбачвала яму ролю, падобную да той, якую на левым баку беларускага палітычнага жыцця выконвала ТБШ. Толькі пад ціскам Беларускага сялянскага саюза яго статутная дзейнасць пашырылася на справы гаспадарчыя[4].

Паводле Статуту, Інстытут павінен займацца падтрымкай сельскай гаспадаркі ва ўсіх яе адгалінаваннях, у т. л. пчалярстве, агародніцтве,

---

[3] Dziennik Wileński. 1925. 18 listop.; Kurier Wileński. Nr 22. 28 stycz.

[4] Stankiewicz J. Biełaruski chryscijanski ruch. Wilnia, 1939. S. 206–208.

перапрацоўцы сельскай сыравіны, пашырэннем тэхнічнай базы, падтрымкай вясковай прамысловасці, рамяства і народнага мастацтва. Стваральнікі Інстытута імкнуліся дасягнуць гэтай мэты, арганізуючы ўзорныя гаспадаркі, якія маглі б служыць прыкладам для сялян, выстаўкі сялянскай тэхнікі, склады тэхнічнага забеспячэння з мэтай пазычання сельскагаспадарчых прыладаў сялянам, меліярацыйных мерапрыемстваў, а таксама шырокую адукацыйную дзейнасць [5]. У рамках адукацыі сялян Інстытут выдаваў (ці хутчэй фінансаваў выданне) усялякую літаратуру, аднак большасць яе сваім зместам мела мала агульнага з гаспадарчымі праблемамі. Найчасцей такая літаратура прапагандавала ідэі дзеячаў БХД.

Аддзелы Інстытута да канца 1926 г. ўзніклі ў Вільні, Радашковічах і Навагрудку. Праз год іх было ўжо звыш пяцідзесяці на тэрыторыі Віленскага і Навагрудскага ваяводстваў. Пад апекай Інстытута дзейнічала 37 бібліятэк. Мабілізацыя грамадства на змаганне за беларускія школы або арганізацыя тэатральнага жыцця былі больш характэрныя для дзейнасці Інстытута, чым чыста гаспадарчая актыўнасць. Аднак акцыя наладжвання лекцый па справах ліквідацыі цераспалосіцы, меліярацыі была агітацыяй за прагрэс у сельскай гаспадарцы. Непасрэдная дзейнасць на карысць стварэння гаспадарчых кааператываў вялася шляхам арганізацыі курсаў для кіраўнікоў гэтых установ. Курсы ладзіліся таксама для эканамістаў, якія маглі б забяспечыць пажаданыя адносіны кааператываў з дзяржаўнай адміністрацыяй. Гэта даволі важна, таму што праз парушэнне заканадаўства адміністрацыя даволі часта спрычынялася да ліквідацыі беларускіх кааператываў. Курсы ладзіліся ў Вільні з вясны 1927 г. У іх удзельнічала каля 40 чалавек, у большасці з правінцыі. Таму часткова за кошт Інстытута для слухачоў былі арганізаваны інтэрнат і кухня. Праўда, умовы жыцця ў інтэрнаце былі даволі цяжкія, але адпаведныя фінансавым магчымасцям слухачоў курсаў.

Восенню 1927 г. сенатары Вячаслаў Багдановіч і Аляксандр Назарэўскі разам з пасламі Фабіянам Ярэмічам і ксяндзом Адамам Станкевічам пачалі падрыхтоўку да стварэння ў Вільні Беларускага прамыслова-сельскагаспадарчага кааператыўнага банка. Не змаглі, аднак, сабраць адпаведнага капіталу, каб ажыццявіць гэтую ініцыятыву. Ужо ў канцы 1920-х гг. аказалася, што беларускае грамадства Віленшчыны і Навагрудчыны з'яўляецца надта бедным, каб разгарнуць там гандлёвую ці прадукцыйную дзейнасць, якая дала б прыбытак для вядзення культурна-асветнай дзейнасці. Кааператывы Інстытута нават ва ўмовах добрай гаспадарчай кан'юнктуры тых гадоў не давалі спадзяванага прыбытку. Складчыны сяброў арганізацыі, ці нават ціхае фінансаванне некаторымі прыхільнымі да беларусаў касцёльнымі

---

[5] Moroz M. Białoruski Instytut Gospodarki i Kultury w północno-wschodnich województwach Drugiej Rzeczypospolitej (1926–1937) // Białoruskie Zeszyty Historyczne. 2000. Nr 14.

[6] Туронак Ю. Беларускія марыяны ў Друі // Спадчына. 1991. № 5.

коламі[6] не давала такіх сродкаў, якія дазвалялі б атрымліваць інвестыцыі. Таму ў 1930-х гг. дзейнасць Інстытута пачала зводзіцца пераважна да адукацыйнай працы, сканцэнтраванай на замацаванні сведамасці насельніцтва. А гэта не магло не выклікаць рэакцыі улад, рэалізуючых палітыку асіміляцыі. З 1933 г. пачалі ліквідавацца лакальныя аддзелы Інстытута. Дзеячам, якія ўзначальвалі ліквідаваныя аддзелы, заўсёды ставіліся ў віну спробы парушэння бяспекі польскай дзяржавы. 22 студзеня рашэннем віленскага ваяводы Бацянскага Інстытут быў ліквідаваны.

Канкурэнцыю для хрысціянска-дэмакратычнага гаспадарчага руху спрабаваў стварыць Янка Станкевіч, віленскі дзеяч, якога як на левым, так і на правым баку называлі паланафілам. Разам з дзеячамі падобнай арыентацыі ён заклікаў да супрацоўніцтва Беларускі гаспадарчы саюз. Станкевіч разлічваў, што ўлады, якія адмоўна ставіліся да хадэцкіх кааператываў, падтрымаюць гаспадарчую дзейнасць лаялістаў. Праз год Саюз, апрача некалькіх кааператываў, паспрыяў пакліканню некалькіх прыватных школаў у Вільні і арганізаваў кнігарню. Спадзяваная датацыя з боку дзяржавы аднак не наступіла. Таму ў 1931 г. Беларускі гаспадарчы саюз спыніў дзейнасць[7].

У пачатку 1930-х гг. у структуры кааператываў вельмі актыўна пачалі ўваходзіць дзеячы КПЗБ. Гаспадарчыя арганізацыі былі тады яшчэ менш падкантрольныя палітычнай паліцыі, чым арганізацыі асветнага або культурнага характару. Улады, аднак, хутка зарыентаваліся, што гаспадарчая дзейнасць служыць камуністам толькі прыкрыццём для палітычнай працы. У канцы 1930-х гг. беларускія кааператывы былі ліквідаваны па тых жа самых прычынах, як і ўсе грамадскія арганізацыі. Заўсёды іх дзеячоў абвінавачвалі ў парушэнні бяспекі дзяржавы. Кожная залатоўка, выдаткаваная, напрыклад, на падтрымку беларускага друку, магла служыць падставай абвінавачання ў антыдзяржаўнай дзейнасці. Прысутнасць камуністаў у кіраўніцтве кааператываў толькі аблягчала ўладам працу.

---

[7] Gomólka K. Białoruskie instytucje życia gospodarczego w II Rzeczypospolitej // Białoruskie Zeszyty Historyczne. 1997. Nr 8. S. 93.

**Рыгор Лазько (Гомель, Беларусь)**

# КЛОПАТЫ МАСКВЫ І ВАРШАВЫ Ў СУВЯЗІ З АКАДЭМІЧНАЙ КАНФЕРЭНЦЫЯЙ 1926 ГОДА

Без перабольшвання можна сказаць, што беларуская культура ў XX стагоддзі развівалася ў фатальных умовах. Пасля няўдалай спробы ўтварэння ў 1918 г. нацыянальнай дзяржавы на яе развіццё пачалі аказваць уплыў такія новыя і трагічныя па сваіх наступствах фактары, як падзел Беларусі паміж Савецкай Расіяй і Польшчай і фарміраванне таталітарнага грамадства ва ўсходняй, савецкай частцы Беларусі. Хаця гэтыя фактары не былі ўзаемна абумоўленыя, але яны не былі і ўзаемна ізаляваныя. У абедзвюх частках «жыўцом» парэзанай Беларусі гаспадарылі ўлады, якім былі чужья інтарэсы беларускага народа. Як у Маскве, так і ў Варшаве гэтыя інтарэсы ацэньвалі з пункту гледжання іх адпаведнасці карэнным інтарэсам савецкага і польскага бакоў. Для Польшчы Заходняя Беларусь была, з аднаго боку, буферам, які аддзяляў дзве антыверсальскія дзяржавы — Германію і Савецкую Расію (СССР), а з другога боку, разам з Заходняй Украінай яна служыла мастом, які злучаў Польшчу з Прыбалтыкай на Поўначы і з Румыніяй, а значыць, і з Балканамі — на Поўдні. Такім чынам, Беларусь была адной з матэрыяльных апор актыўнай палітыкі Польшчы ў Еўропе, накіраванай супраць германа-расійскіх геапалітычных ціскоў.

Для Савецкай Расіі (СССР) пэўны час Заходняя Беларусь была каналам для прасоўвання на Захад сусветнай сацыялістычнай рэвалюцыі, якая, у сваю чаргу, мусіла служыць сродкам разбурэння версальскай сістэмы, пачынаючы з яе польскага звяна — аднаго з важнейшых у гэтай сістэме. Такая роля адводзілася Заходняй Беларусі да пачатку 1930-х гг., пакуль не змяніліся прыярытэты савецкай знешняй палітыкі. У сувязі з гэтай задачай разглядалася і палітыка беларусізацыі, адным з фрагментаў якой была акадэмічная канферэнцыя 1926 г. па рэфармаванню правапісу беларускай мовы. «Беларусізацыя» была сродкам умацавання савецкай улады ў БССР і пашырэння яе ўплываў па другі бок «рыжскай» мяжы, сродкам недапушчэння фарміравання за межамі БССР беларускіх «П'емонтаў» — асяродкаў беларускага нацыянальнага адраджэння, здольных выпраменьваць на Усход ідэі і ўплывы, прыцягваць да сябе ўвагу і спадзяванні, выхоўваць беларускія творчыя сілы. Такое стаўленне да Беларусі з боку Масквы і Варшавы перадвызначыла ператварэнне Заходняй Беларусі ў поле зацятай савецка-польскай ідэалагічнай і палітычнай барацьбы, якая ішла тут да пачатку 1930-х гг. — да часу, пакуль не склалася кан`юктурная, тактычная зацікаўленасць урада ў захаванні версальскага статус-кво. Беларускія нацыянал-камуністы спрабавалі ўдзельнічаць у гэтай барацьбе ў якасці своеасаблівай «трэцяй сілы», спадзеючыся выкарыстаць яе ў інтарэсах аб'яднання Беларусі.

Польска-савецкая барацьба за Беларусь выявілася і ў такой, здавалася б, далёкай ад палітыкі справе, як навуковая канферэнцыя па праблемах рэфармавання правапісу. Пытанне аб канферэнцыі было пастаўлена ў палітычны кантэкст задоўга да яе адкрыцця, яшчэ ў пастанове ЦК КП(б)Б ад 14 жніўня 1925 г. наконт мэтазгоднасці склікання беларускай палітычнай канферэнцыі ў Берліне. Адным з сямі патрабаванняў да групы А. Цвікевіча, якімі абумоўлівалася падтрымка ЦК КП(б)Б яе ініцыятывы аб скліканні Берлінскай канферэнцыі, была падтрымка ёю «сусветнага з'езда беларусазнаўцаў у Мінску» [1].

Пасля Берлінскай канферэнцыі група вядомых дзеячаў беларускага нацыянальнага адраджэння вярнулася з-за мяжы ў Савецкую Беларусь, іншыя пайшлі далей па шляху супрацоўніцтва з камуністамі (група БСР Грамады ў Польшчы) ці супрацоўніцтва непасрэдна з савецкімі дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі (група Галавінскага ў Літве). Аднак заставаліся яшчэ групы беларускіх дзеячаў, якіх не ўдалося падпарадкаваць уплывам камуністычных уладаў Мінска, а значыць, і Масквы. Вацлаў Ластоўскі, сімвалічная фігура беларускага нацыянальнага адраджэння, рашэнняў Берлінскай канферэнцыі не прыняў. Не згадзіліся з прызнаннем Мінска ў якасці адзінага цэнтра беларускага нацыянальнага руху і дзеячы пражскага асяродка гэтага руху на чале *з* прэзідэнтам БНР П. Крачэўскім, у большасці — дзеячы эсэраўскага накірунку. Гэтыя людзі не жадалі супрацоўнічаць з беларускімі камуністамі, бо бачылі за імі сілу, варожую беларускаму адраджэнню [2]. Аднак, застаючыся на нацыянальным грунце, усе яны былі гатовыя змагацца за беларускую культуру, аддаваць яе развіццю ўсе свае сілы, шукалі дзеля гэтага матэрыяльную і духоўную апору. Мінскія камуністычныя ўлады імкнуліся выкарыстаць гэтыя патрыятычныя імкненні беларускай інтэлігенцыі з-за межаў Савецкай Беларусі, маючы на мэцеператварэнне Мінска ў адзіны цэнтр беларускага нацыянальнага руху і падпарадкаванне яму антыпольскай акупацыі ў Заходняй Беларусі, дзе існавала масавая сацыяльная база для гэтага руху.

Адпаведная задача была пастаўлена адразу пасля Берлінскай канферэнцыі пад уплывам дасягнутага на ёй поспеху. У тэзісах ЦК КП(б)Б, зацверджаных 16 кастрычніка 1925 г., перад ЦК ВКП(б) ставілася пытанне аб наданні Мінску статуса цэнтра, які па ўзгадненні з наркаматам замежных спраў СССР і ЦК ВКП(б) кіраваў бы беларускім нацыянальным рухам за мяжой. Мэтай гэтага кіраўніцтва было падпарадкаванне нацыянальнага руху «і ператварэнне ў рэвалюцыйны рух пад лозунгам аб'яднання беларускага народа, стварэнне адзінай Беларусі і ўстанаўленне ў ёй рабоча-сялянскай Савецкай улады» [3]. Гэтыя тэзісы пад назвай «Аб беларускім руху

---

[1] Идеологическая деятельность Компартии Белоруссии. Минск, 1990. Ч. 1. С. 172.

[2] Гл.: Калеснік У. Пражскі эпісталярый // Калеснік У. Усё чалавечае. Мн., 1993. С. 267.

[3] Идеологическая деятельность... С. 197.

за кардонам» былі падрыхтаваныя для нарады, якая рыхтавалася ў Маскве — верагодна, з удзелам кіраўнікоў КПЗБ і БСР Грамады [4]. Навуковая канферэнцыя, прысвечаная праблемам рэфармавання беларускага правапісу, як справа фармальна непалітычная, добра выдавалася ў якасці сродка, здольнага прыцягнуць да супрацоўніцтва з Мінскам дзеячаў з беларускага замежжа, якія стаялі на раздарожжы».

Мне пакуль не ўдалося знайсці матэрыялы маскоўскай нарады 1925 г., але калі меркаваць па логіцы наступных падзей, звязаных з гэтай справай, то складваецца ўражанне, што нарада не прынесла поўнага поспеху мінскім камуністам. Відавочна, Мінску была нададзена роля цэнтра, кіруючага беларускім рухам за мяжой, але яна абмяжоўвалася апекай з боку супрацоўнікаў наркамата замежных спраў СССР — у той час яго прадстаўніка пры ўрадзе БССР С. Л. Казюры і саветніка паўпрэдства СССР у Польшчы А. Ф. Ульянава. Гэтага абмежавання паўнамоцтваў мінскія камуністы, відаць, не спадзяваліся пазбегнуць, а вось невыдзяленне Масквой грошай на правядзенне першага беларускага навуковага кангрэса было сапраўднай прыкрасцю. Па гэтай прычыне Камісія па замежных справах пры ЦК КП(б)Б 1 лютага 1926 г. прыняла пастанову аб адтэрміноўцы кангрэса да мая, адначасова даручыўшы С. Казюру паклапаціцца пра выдзяленне грошай [5]. Вясной тэрмін яго правядзення быў перанесены яшчэ раз. Акрамя грашовай праблемы, якая стрымлівала лінгвістычныя пошукі мінскіх камуністаў, у іх з'явіўся яшчэ адзін клопат, які мог прынесці больш эфектныя, хуткія і больш відавочныя вынікі — узбуйненне Беларусі за кошт часткі расійскай у той час Гомельскай губерні. У маі 1926 г. ЦК КП(б)Б звярнуўся ў ЦК ВКП(б) з абгрунтаваннем неабходнасці далучэння Гомельскай губерні да БССР, умела выкарыстоўваючы ў гэтай справе зацікаўленасць Масквы ў пашырэнні рэвалюцыйных настрояў у Польшчы [6].

Пытанне пра акадэмічную канферэнцыю заставалася як бы на другім плане ў дзейнасці мінскіх камуністаў да жніўня 1926 г. К гэтаму часу выявіліся спробы Ю. Пілсудскага павесці пэўную палітычную гульню з тымі групамі беларускага насельніцтва, якія не далучыліся да «Грамады». На гэта звярталі ўвагу ў сваім лісце ў калегію НКЗС загадчык аддзела Прыбалтыкі і Польшчы гэтага наркамата Лагіноўскі і саветнік паўпрэдства СССР у Польшчы А. Ф. Ульянаў. Сакратар ЦК КП(б)Б А. Крыніцкі меў у сябе гэты ліст не пазней, чым яго асноўны адрасат, перад 14 жніўня 1926 г. Выявай такіх спробаў Пілсудскага А. Крыніцкі, са свайго боку, называў стварэнне ў Вільні Інстытута беларускай гаспадаркі і культуры, абмеркаванне

[4] Аб маскоўскай нарадзе па пытаннях дзейнасці «Грамады» піша А. Бергман // Слова пра Браніслава Тарашкевіча. Мн., 1996. С. 88.

[5] Знешняя палітыка Беларусі. Т. 2. (1923–1927). Мн., 1999. С. 203.

[6] Гл.: Лазько Р., Мурашка М. На скрыжаванні вялікай палітыкі: аб вяртанні Гомельшчыны ў склад БССР // Беларускі гістарычны часопіс. 1996. № 1. С. 21–30.

ідэі аб утварэнні беларускай аўтаномнай адзінкі ў складзе польскай дзяржавы на базе трох паўночна-заходніх ваяводстваў і інш. [7]

Магчыма, перабольшваючы значэнне гэтай гульні Пілсудскага ў беларускім пытанні, кіраўнікі КП(б)Б актывізавалі свае намаганні ў абодвух накірунках — як у справе далучэння Гомельшчыны да БССР, так і ў справе падрыхтоўкі акадэмічнай канферэнцыі. У другой палове жніўня праз паўпрэда СССР у Літве С. Александроўскага былі наладжаны кантакты з Ластоўскім. 23 жніўня Александроўскі паведаміў прадстаўніку НКЗС у Мінску, што «пасля некалькіх папярэджанняў праз Галавінскага да мяне, нарэшце, прыйшоў Ластоўскі» [8] . Пачаліся доўгія перамовы з мэтай схіліць Ластоўскага «да мінскай арыентацыі». Будучай акадэмічнай канферэнцыі надавалася рашаючае значэнне ў гэтай справе. С. Казюра тлумачыў Александроўскаму значэнне місіі, яую яму выпала ажыццявіць: «Мінск… улічвае той палітычны эфект, які будзе выкліканы гэтай канферэнцыяй сярод беларускіх колаў і арганізацый за мяжой, а таксама ў Польшчы» [9] . Падчас канферэнцыі планавалася вырашыць і пытанне аб магчымасці пакінуць Ластоўскага ў Мінску [10] , улічваючы, што ён паступова схіляўся да гэтага рашэння, спакушаючыся перспектывамі творчай працы ў Савецкай Беларусі. Так яно і адбылося — пасля канферэнцыі Вацлаў Ластоўскі вяртаўся ў Коўна, каб сабрацца для ад'езду ў Савецкую Беларусь назаўсёды. Нягледзячы на свой немалы жыццёвы і палітычны вопыт, ён не здолеў падчас мінскіх сустрэч адчуць, як смяюцца за яго спіной прадстаўнікі Масквы ў прадчуванні, што задуманае ўдаецца. 17 лістапада С. Казюра паведаміў у НКЗС аб сваіх сустрэчах з гасцямі канферэнцыі: «Наогул знаходжанне ў Мінску ўсіх гэтых «беспощадных героев» — закардонных беларусаў — я пастараюся выкарыстаць як найпаўней» [11].

Не засталіся абыякавымі да акадэмічнай канферэнцыі і варшаўскія інстанцыі. Аб гэтым сведчыць перапіска генконсульства Польшчы ў Мінску з польскім пасольствам у СССР і міністэрствам замежных спраў у Варшаве. Гэтыя крыніцы, у прыватнасці, дазваляюць праліць крыху святла на акалічнасці нявыезду на канферэнцыю дзеячаў беларускай культуры з Заходняй Беларусі. Даведаўшыся аб гэтым з беларускіх савецкіх газет, генконсул Т. Пяркоўскі 16 лістапада паведаміў гэты факт варшаўскаму МЗС [12]. Яно ж, у сваю чаргу, ацаніўшы яго «выдатнае прапагандысцкае значэнне», звярнулася за тлумачэннямі ў Міністэрсгва ўнутрэных спраў (МУС). Адтуль прыйшоў адказ, што ў віленскае ваяводскае ўпраўленне звярнуліся

---

[7] НАРБ. Ф. 4, воп. 21, спр. 2546, арк. 5, 13; Голас Радзімы. 1994. 14 крас. С. 4.

[8] Скарыніч: Літаратурна-навуковы гадавік. Вып. 3. М.; Мн.; Смаленск, 1997. С. 61.

[9] Тамсама. С.57.

[10] Знешняя палітыка Беларусі. Т. 2. С. 226.

[11] Скарыніч. Вып.3. С. 63.

[12] Archiwum Akt Nowych w Warszawie (AAN). Wydział Wschodni. Sygn. 6703 A, ł. 48.

А. Луцкевіч, Р. Астроўскі і І. Дварчанін з просьбамі аб выдачы ільготных пашпартоў для выезду ў Мінск на канферэнцыю. Паразумеўшыся з МУС, ваяводскае ўпраўленне адмовіла ім у выдачы такіх пашпартоў на той падставе, што ўсе трое, як выдатныя дзеячы БСР Грамады, былі вядомыя сваёй «варожай для польскай дзяржавы дзейнасцю» [13]. Беларускія паслы польскага сейма, у прыватнасці, Б. Тарашкевіч, яшчэ мелі права на ільготныя папшарты, атрымалі іх, аднак паехаць адмовіліся. Начальнік дэпартамента МУС пісаў, што адмовіліся «быццам бы ў знак салідарнасці», як бы дапускаючы гэтымі словамі іншую прычыну нявыезду. Магчыма, яна сапраўды існавала, калі ўлічыць, што дзейнасць «Грамады» ў гэты час набліжалася да сваёй кульмінацыі, урад рыхтаваўся да яе разгрому і якраз у адзін з дзён, калі ў Мінску працавала акадэмічная канферэнцыя — 16 лістапада Б. Тарашкевіч мусіў выступаць у сейме з вялікай прамовай у яе абарону.

Такім чынам, з Польшчы на канферэнцыю выехалі толькі два чалавекі: драматург Ф. Аляхновіч з Вільні [14] і прафесар Варшаўскага універсітэта Ю. Галомбэк, вядомы спецыяліст па гісторыі беларускай і паўднёва-славянскіх літаратур. Высвятляецца, што паездка прафесара Галомбэка таксама мела палітычны антураж. Яна была здзейснена па ініцыятыве Міністэрства замежных спраў (МЗС) і пад яго апекай [15]. Прафесар выступіў у Мінску з дакладам «Даследаванне беларускай літаратуры XIX в. — да 1863 г.».

Вярнуўшыся з Мінска, ён зрабіў справаздачу Аддзелу друку МЗС, датаваную 2 снежня 1926 г. [16]. Натуральна, яго куратараў з МЗС цікавілі не навуковыя вынікі канферэнцыі, а яе грамадскі рэзананс і яшчэ шырэй — стан працэсу беларускай нацыятворчасці і дзяржаватворчасці на аснове БССР, а таксама ўплыў гэтых працэсаў на беларускае насельніцтва ў Польшчы. На гэтых пытаннях і засяродзіў увагу прафесар Ю. Галомбек. Ён адзначыў, што Савецкая Беларусь аб’ектыўна з’яўляецца метраполіяй беларушчыны і паспяхова падтрымлівае гэты свой статус. Тут «у кожнай сферы культурная праца развіваецца свабодна і энергічна». Паколькі камунізм «даў свабоду нацыянальнага развіцця», то ў краіне «растуць камуністычныя настроі». Аднак, на думку прафесара, камуністычная ідэалогія «з’яўляецца нечым штучным, накінутым, беларусы прасякнуты пэўным кансерватызмам». Цяжка не згадзіцца з такой ацэнкай.

Напэўна, міністэрства замежных спраў найбольш цікавілі заўвагі прафесара Галомбэка аб уплыве нацыянальна-культурных працэсаў у Савецкай Беларусі на Польшчу. Прафесар пісаў, што «савецкія беларусы» найбольшую ўвагу звяртаюць на становішча беларусаў у Польшчы і бачаць

---

[13] AAN. Wydział Wschodni. Sygn. 6703 A, ł. 43, 44.

[14] С. Казюра сцвярджаў, што не дапусціў Ф. Аляхновіча да ўдзелу ў канферэнцыі // Скарыніч. Вып. 3. С. 64.

[15] AAN. Sygn. 6703 FA, ł. 48.

[16] Тамсама, ł. 19–20.

тут іх «найбольшы ўціск» у параўнанні з іншымі краінамі. Польскі назіральнік не сказаў, што такія ацэнкі адпавядаюць рэальнаму становішчу беларускага насельніцтва ў Польшчы. Ён іх патлумачыў тым, што ў Польшчы знаходзіцца найбольшая колькасць беларусаў па-за межамі БССР. Далей прафесар Галомбек звярнуў увагу на тыя каналы, праз якія праводзяцца ўплывы Савецкай Беларусі на Заходнюю Беларусь. Гэта, перш за ўсё, «багатая прэса», якая выдаецца за мяжой і даступная ў Польшчы. У якасці прыкладу былі названыя газеты «Голас беларуса» ў Рызе і пражская «Замежная Беларусь», якія фінансаваліся з Мінска.

Наступны фрагмент з даклада варшаўскага прафесара, напэўна, з'яўляецца ключавым у ім, яго квінтэсенцыяй. «Здаецца, — пісаў Ю. Галомбек, — што ў сувязі з існаваннем фармальна незалежнай Беларусі і ўзнікненнем нацыянальнага фактара, не прадвызначаючы трываласць гэтай з'явы, спрэчка аб беларускай нацыянальнасці ўяўляецца беспрадметнай. Барацьба можа весціся, хутчэй, за межы тэрытарыяльных прэтэнзій гэтай нацыянальнасці» [17]. Безумоўна, прафесар меў на ўвазе, перш за ўсё, барацьбу навуковую, але магчыма і палітычную. Аднак чытачы яго справаздачы, ці тыя, каму паведамляліся выкладзеныя ў ёй ідэі, глядзелі на беларускую праблему перадусім, як на палітычную.

У гэтыя дні ў асяроддзі Пілсудскага якраз выспявала рашэнне аб неабходнасці разгрому «Грамады», якая, як вядома, спрабавала весці барацьбу за тэрыторыю беларускай нацыі на захадзе Беларусі. У канцы лістапада ў Вільні Пілсудскі правёў некалькі нарад па пытаннях дзейнасці Грамады, на якіх, відавочна, яна кваліфікавалася як накіраваная на раскол Польскай Рэспублікі [18] . У пачатку студзеня ён жа дамовіўся з маршалкам сейма Ратаем аб арышце лідэраў «Грамады», беларускіх паслоў сейма, нягледзячы на іх дэпутацкую недатыкальнасць. Безумоўна, нельга лічыць, што акадэмічная канферэнцыя ў Мінску прама паўплывала на прынятае Пілсудскім рашэнне. Аднак яе рэзананс у Польшчы, з'яўляючыся яшчэ адным сведчаннем выкарыстання Масквой усіх сродкаў для правядзення ў Польшчы прасавецкіх уплываў, садзейнічаў фарміраванню той палітычнай атмасферы, у якой разгром «Грамады» аказаўся не толькі магчымым, але і непазбежным.

Падводзячы вынікі акадэмічнай канферэнцыі і ў Мінску, мінскім партыйным уладам давялося прызнаць, што не ўсё на ёй прайшло гладка. А. Крыніцкі ў сваім дакладзе ЦК ВКП(б) каяўся ў тым, што зала пасяджэнняў канферэнцыі была дэкарыраваная ў беларускія нацыянальныя колеры, што спачатку адсутнічаў партрэт Леніна і герб СССР, занадта цёплы прыём у Мінску быў аказаны Аляхновічу і г. д. Аднак, на яго думку, канферэнцыя «садзейнічала ўмацаванню ў вачах замежных дэлегатаў значэння

[17] AAN. Sygn. 6703 FA, ł. 19.

[18] Гл.: Лазько Р. Хто ж знішчыў «Грамаду»? // Беларуская мінуўшчына. 1994. № 2. *С.* 46–49.

Мінска як адзінага палітычнага і культурнага цэнтра ўсёй Беларусі…, а таксама лепшаму разуменню таго, што толькі СССР стварае ўмовы і гарантыі правільнага вырашэння нацыянальнага пытання для раней прыгнечаных нацыянальнасцей» [19]. Якія гэта былі «гарантыі», стане ясна праз некалькі гадоў. Наступленне ў СССР сацыялізму «па ўсім фронце» і разгром рэшткаў «Грамады» ў Польшчы — пасольскага клуба «Змаганне» — пазбавілі савецкае кіраўніцтва цікавасці да беларускага нацыянальнага руху як сродку «расшывання» польскай дзяржавы па нацыянальных швах. З гэтага часу скончылася і гульня ВКП(б) з беларускай нацыянальнай інтэлігенцыяй.

---

[19] НАРБ, ф. 4, воп. 21, спр. 2546, арк. 2.

KAMUNIKAT.org